**Пётр** Явіч : ілюстраваны альбом жывапісных твораў / склад. В. Рыбакоў, М. Рызо ; аўт. тэксту М. Гугнін. — Віцебск, 1999. — С. 26—35.— На бел., рус., венг. і англ. мовах.

## ПЁТР ЯВІЧ

Творчы шлях надзвычай цэльнага і таленавітага мастака П. М. Явіча пачынаўся ў Віцебску больш за 70 год таму.

Біяграфія П. М. Явіча мае рамантычны пачатак. Бацька мастака, ураджэнец Віцебска, у гады Першай сусветнай вайны трапіў у аўстра-венгерскі палон і знаходзіўся ў невялікім венгерскім гарадку Цёрэксентміклаш. Там ён ажаніўся, і 5 верасня 1918 года ў іх сям'і нарадзіўся сын Іштван. Імя Пётр ён атрымаў ужо ў Беларусі. А ў 1925 годзе бацька вярнуўся на радзіму і пачаў абжывацца ў Віцебску. Праз год да яго прыехала жонка з сынам. Так з 1926 года пачаўся віцебскі перыяд жыцця Пятра Максавіча.

Тут лёс звёў яго з выдатным мастаком і педагогам Юрыем Маісеевічам Пэнам. Па просьбе Юрыя Маісеевіча бацька зрабіў пераклад артыкула з венгерскага часопіса і, магчыма, у знак падзякі за гэта майстра запрасіў хлопчыка ў сваю майстэрню. Гэта сустрэча прадвызначыла яго жыццёвы выбар. На працягу двух гадоў, пасля заняткаў у школе, Пётр хадзіў да Ю. Пэна.

Пасля заканчэння сямігодкі ў 1934 годзе юнак паступае ў Віцебскае мастацкае вучылішча (да 1934 года – тэхнікум), адзіную ў той час мастацкую навучальную ўстанову ў Беларусі. Пасля заканчэння вучылішча Пётр Явіч атрымаў накіраванне ў Ленінградскую Акадэмію мастацтваў, аднак паехаць вучыцца не змог. Дырэктар вучылішча Дабравольскі накіраваў яго ў Вялікі акадэмічны тэатр оперы і балета Беларусі памочнікам дэкаратара. Аднак Пётр Максавіч аддае перавагу станковаму жывапісу і вяртаецца ў Віцебск. Тут ён працуе мастаком-рэтушорам у рэдакцыі газеты «Віцебскі рабочы». У снежні 1939 года на абласной мастацкай выставе, што адбывалася ў клубе панчошна-трыкатажнай фабрыкі, было прадстаўлена шэсць работ мастака, адну з якіх («Партрэт дзяўчынкі») закупіў Дзяржаўны мастацкі музей БССР. У 1947 годзе перайшоў працаваць у мастацкія майстэрні. У 1949 годзе быў прыняты ў Саюз мастакоў БССР і прызначаны ўпаўнаважаным ад Саюза мастакоў па Віцебскай вобласці, выконваючы гэты абавязак больш за 10 гадоў.

Ужо ў першыя пасляваенныя гады Пётр Явіч здабыў славу аднаго з лепшых партрэтыстаў Віцебшчыны, і па сённяшні дзень яго аўтарытэт майстра партрэтнага жанру вельмі высокі. У канцы 40-х – пач. 50-х гадоў жывапісец стварае выдатную партрэтную галерэю артыстаў акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа ў Віцебску: Алены Радзілоўскай, Мікалая Звездачотава, Паўла Малчанава і іншых. Мастака цікавяць, перш за ўсё, характар і тэмперамент, ён захоўвае жывую, непаўторную індывідуальнасць кожнага майстра сцэны.

Асаблівае месца ў творчасці Пятра Явіча складаюць партрэты легендарнага партызанскага камбрыга Міная Піліпавіча Шмырова. Шмат партрэтных работ прысвечана спадарожніцы жыцця і добрай музе яго творчага генія Лідзіі Ільінічне Явіч. Пэндзалю майстра належаць нацюрморты, пейзажы.

**М. ГУГНІН**

*Уступны артыкул да каталога апублікаваны ў скарачэнні*